# Урок беларускай літаратуры
# «Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас паэзіі П. Панчанкі»
# (10 клас)

**В. І. Беляня,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 1 імя П. Васіленкі г. Свіслачы

Дарожная карта – гэта своеасаблівая мадэль урока, праграма дзеянняў, якая дазваляе планаваць разнастайную дзейнасць вучня на ўроку. Яна можа быць выкарыстана для арганізацыі калектыўнай і індывідуальнай дзейнасці вучняў. Мае неабмежаваныя магчымасці ў выкарыстанні схем, табліц, кластараў і інш. Дазваляе структурыраваць і сістэматызаваць матэрыял, праводзіць аналіз і сінтэз, вылучаць галоўнае і другараднае. Вучню дарожная карта дапамагае ўбачыць шлях урока да дасягнення мэты, аб’ём неабходных для засваення ведаў, з’яўляецца апорай для замацавання і паўтарэння. Запоўненая карта дае магчымасць настаўніку ацаніць узровень засваення тэмы, аб’ём выкананай работы, прабелы ў ведах, неабходнасць арганізацыі паўтарэння.

Выкарыстанне метаду дарожнай карты на дадзеным уроку абумоўлена неабходнасцю вывучэння і сістэматызацыі вялікага аб’ёму матэрыялу. Дарожная карта дае магчымасць паказаць узаемасувязь розных паняццяў, самастойна зрабіць кампактны ўласны канспект урока, паступова выконваючы заданні і дапаўняючы яго важнай інфармацыяй. Пасля поўнага запаўнення карты вучні маюць цэласнае ўяўленне пра асобу аўтара і тэматычную разнастайнасць творчасці.

**Тэма. Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас паэзіі П. Панчанкі.**

**Мэта ўрока**: раскрыць патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас твораў П. Панчанкі, адметнасць выяўлення патрыятычных пачуццяў праз вобразна-выяўленчыя сродкі.

**Задачы**:

- ❒ пазнаёміць з асноўнымі звесткамі біяграфіі П. Панчанкі, ахарактарызаваць час, у які жыў і пісаў аўтар;
- ❒ удасканальваць навыкі аналізу лірычнага твора: уменне выкарыстоўваць параўнанне (эмпірычнае і тэарэтычнае), аналіз (эмпірычны і тэарэтычны), сінтэз і класіфікацыю, абагульняць, фармуляваць вывады і прыводзіць доказы;
- ❒ спрыяць фарміраванню патрыятычных пачуццяў і сістэмы каштоўнасных арыентацый;
- ❒ развіваць вуснае маўленне, уменне аналізаваць лірычны твор паводле плана, фарміраваць навыкі самаадукацыі;
- ❒ фарміраваць навыкі самаадукацыі: уменне планаваць дзейнасць, накіраваную на рашэнне тактычных вучэбных задач, вызначыўшы паслядоўнасць і час на выканання; апісаць атрыманы вынік і адэкватна ацаніць; аргументаваць уласнае меркаванне;
- ❒ уменне ацаніць узровень сваей вучэбна-ўпраўленчай кампетэнтнасці;
- ❒ псіхалагічная гатоўнасць да сумеснай дзейнасці, арыентацыя на дыялог і супрацоўніцтва.

**Тып:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** мультыборд.

## Ход урока

I. **Арганізацыйны момант. Слова настаўніка**. **Праверка дамашняга задання**

**Настаўнік.** Сярод мноства паэтаў і пісьменнікаў,з якімі мы пазнаёміліся на мінулым уроку і чыя творчасць прыпадае на першыя ваенныя дзесяцігоддзі, многа слаўных,знакамітых імён. Кожны пакінуў прыкметны след у гісторыі беларускай літаратуры. На мінулым уроку на аснове інфармацыі падручніка было створана воблака слоў. Арыентуючыся на яго, дайце агульную характарыстыку развіцця беларускай літаратуры 1945-1965 гадоў. *(На экране – воблака слоў. Адказы вучняў.)*

**II. Паведамленне тэмы і мэт урока.**

**Настаўнік.** Героем нашага сённяшняга ўрока з'яўляецца Пімен Панчанка. Слова ***герой*** я выбрала невыпадкова. У ходзе ўрока вы зразумееце яго сапраўднае значэнне. Мы пазнаёмімся з біяграфіяй і асаблівасцямі творчасці Пімена Панчанкі.

Вершы П. Панчанкі даўно разабраны на цытаты.Мудрыя думкі аўтара і сёння навучаюць нас. У пачатку ўрока я хацела б, каб мы з вамі адгадалі тую чалавечую якасць, якую Пімен Панчанка лічыў найгалоўнейшай. Адгадаць яе мы зможам, успомніўшы радкі з верша,з якім пазнаёміліся ў 6 класе.

Перад вамі- дарожная карта ўрока. Запаўняючы яе на працягу ўрока,у выніку мы атрымаем план-канспект урока.

*На экране дэманструюцца слайды з выявамі кветак, якія ўпамінаюцца ў вершы П. Панчанкі "Сармацкае кадзіла" – чарамша,сон-трава, чаравічок Венерын, сармацкае кадзіла, а таксама любімыя кветкі П. Панчанкі – касачы. Гульня нагадвае медыяазбуку, вучні запаўняюць пустаграфку ў дарожнай карце. Атрымліваецца слова "чалавечнасць".*

Пытанне да вучняў:

- ✓ Як вы разумееце слова чалавечнасць?

**III. Інфармацыйны этап**

**Настаўнік.** Жыццё і творчасць Пімена Панчанкі ахоплівае амаль усё дваццатае стагоддзе.У наступным пункце дарожнай карты прапаную ўстанавіць узаемасувязь паміж паняццямі "эпоха", "біяграфія", "творчасць". А дапаможа нам у гэтым цытата акадэміка Д. Ліхачова: «Ва ўсякай біяграфіі прысутнічае эпоха… Стварэнне твора ёсць факт біяграфіі аўтара, біяграфія аўтара ёсць факт гісторыі, гісторыі літаратуры ў прыватнасці. Таму па сваёй сутнасці біяграфія пісьменніка – гэта перажыванне асабістага жыцця ў гісторыі». Патлумачце.

*Вучні прыходзяць да вываду, што час аказвае ўплыў і на біяграфію,і на творчасць.*

**Настаўнік.** Перад тым як пазнаёміцца з асобай і творчасцю П.Панчанкі, давайце ўспомнім гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў дваццатым стагоддзі.

*Паведамленне вучня пра гістарычныя падзеі дваццатага стагоддзя (у выглядзе стужкі часу.*

**Настаўнік.** Як бы вы ахарактарызавалі гэту эпоху? *(Адбылося шмат трагічных падзей,у якіх людзі прайшлі праз розныя выпрабаванні.)*

*Паведамленне вучня пра асноўныя звесткі з біяграфіі П.Панчанкі ў выглядзе асабістага календара.*

- ✓ Ці наклала эпоха адбітак на біяграфію П.Панчанкі?
- ✓ Што здзівіла ў біяграфіі?

**Настаўнік.** Кажуць, што паэзія – гэта споведзь веку, прапушчаная праз уласнае сэрца. Прапаную вашай увазе вынікі работы над праектам "Аб чым сведчаць назвы зборнікаў і вершаў П. Панчанкі"? *(Вучань прааналізаваў назвы зборнікаў і вершаў,зрабіў вывады пра тэматычную разнастайнасць і асаблівасці найменняў.)* Такім чынам, эпоха, біяграфія і творчасць паэта цесна ўзаемазвязаны паміж сабой.

**IV. Музычная паўза. Гучыць песня І. Лучанка на словы П. Панчанкі "Жытнёвы звон".**

**V. Знаёмства з творчасцю П.Панчанкі. Аналіз вершаў**

**Настаўнік.** Пісьменнік-франтавік Васіль Быкаў быў вельмі ўражаны радкамі з аднаго з вершаў П. Панчанкі. Ён адзначаў: "Думаецца, калі б ён пра фронт не напісаў больш нічога, дык толькі гэтых радкоў хапіла б, каб выказаць усю сутнасць вайны". Зразумела, што размова ідзе пра верш "Герой".

*Гучыць выразнае чытанне верша "Герой"* (на памяць – апераджальнае заданне).

- ✓ Прааналізуйце верш, карыстаючыся алгарытмам.
- ✓ Чаму герой твора не мае імені?
- ✓ Успомніце, што такое пафас. Вызначце пафас верша "Герой". Ці можна сцвярджаць, што пафас у гэтым вершы і патрыятычны, і жыццесцвярджальны? *(На аснове адказаў вучні запаўняюць табліцу ў дарожнай карце).*

- ✓ У ваенны час героем стаць лёгка. А ці есць героі сярод нашых сучаснікаў? Што такое надзвычайнае трэба зрабіць,каб стаць героем сёння? (разважанні вучняў)
- ✓ У 1964 годзе П.Панчанка напісаў верш “Родная мова”. Праслухайце верш у выкананні П.Панчанкі.
- ✓ Прааналізуйце верш, карыстаючыся алгарытмам.
- ✓ Вызначце пафас верша.
- ✓ Здапамогай сродкаў візуалізацыі *(малюнкі на слайдзе)* вызначце вобразныя сродкі, ужытыя ў вершы. Запоўніце адпаведную табліцу ў дарожнай карце.
- ✓ Зрабіце вывад, якуюролю выконваюць вобразна-выяўленчыя сродкі ў вершы.
- ✓ Як было адзначана ў пачатку ўрока, многія радкі П.Панчанкі ўспрымаюцца як афарызмы. Прапаную паслухаць эсэ “Запавет П.Панчанкі нашчадкам”, напісанае вучнем загадзя на аснове верша “Той дзень прапаў…”. У дарожных лістах адзначце тры правілы, якія вы хацелі ўзяць для сябе і кіравацца імі ў жыцці.
- ✓ Ці згодны вы, што радкі П. Панчанкі не страцілі сваёй актуальнасці?
- ✓ На якія агульнавядомыя правілы яны падобны? (запаведзі Бібліі)
- ✓ Які настрой, пафас прасочваецца ў вершы “Тойдзень прапаў…”?

**VI. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

**Настаўнік.** Мы пазнаёміліся толькі знекаторымі вершамі П.Панчанкі. На наступным уроку мы працягнем наша знаёмства. Спадзяюся, першаснае ўражанне аб паэце ў вас склалася. Прашу вас прыняць удзел у стварэнні воблака слоў,у цэнтры якога-асоба П.Панчанкі. Выберыце самае галоўнае слова, якое непасрэдна адносіцца да паэта, і патлумачце свой выбар.

**VII. Дамашняе заданне**. Вывучыць верш “Герой” на памяць.

## Дарожная карта ўрока

Прадмет: беларуская літаратура

Тэма. Патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас паэзіі П.Панчанкі

1. Жыццёвае крэда П.Панчанкі

| 1 | 2. | 3. | 4. | 5. | 6. | 7. | 8. | 9. | 10. | 11. | 12. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | ь |

2. Устанавіце ўзаемасувязь паняццяў: эпоха,біяграфія, творчасць.



Пазначце найбольш значныя даты

3.Тэматычная разнастайнасць творчасці:

-

-

-

-

4.Верш “Герой”

| Тэма | Ідэя | Пафас |
|---|---|---|
| | | |

Пафас- эмацыянальны змест мастацкага твора,пачуцці і эмоцыі, якія аўтар укладвае ў змест,чакаючы суперажывання. У залежнасці ад пачуццяў бывае-рамантычны, патрыятычны, сатырычны,жыццесцвярджальны.

5. Герой у сучасным жыцці ______________________________________________

6. Верш “Родная мова”

| Эпітэты | Метафары | Параўнанні | Пафас |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

Роля мастацкіх

сродкаў:____________________________________________________

7. Запавет:

-

-

8. Маё слова для “воблака слоў”___________________________

9.Д.з.Верш “Герой” на памяць

Алгарытм аналізу паэтычнага твора

1. Час і абставіны напісання твора.
2. Пачуцці і эмоцыі, якія выклікае твор.
3. Асацыяцыі, звязаныя з творам (з якімі творамі асацыіруецца тэкст? з якімі сітуацыямі? з якімі гукамі, колерамі, выявамі, пахамі, адчуваннямі?).
4. Тэма (пра што напісаны твор?).
5. Ідэя (якую думку аўтар хацеў данесці гэтым творам?).
6. Назва (чаму твор мае такую назву?).
7. Жанр (верш — грамадзянскай, філасофскай, інтымнай, пейзажнай лірыкі; раманс, песня, балада, байка, паэма або інш.).
8. Кампазіцыя (якія часткі вылучаюцца ў творы? змена якіх эмоцый рухае лірычнае перажыванне?).
9. Мастацкія вобразы. Сімвалы, дэталі, пейзаж (калі ёсць).
10. Лірычны герой (як паказаны?).
11. Выяўленчыя сродкі (тропы — эпітэты, метафары (у тым ліку ўвасабленне, метанімія, сінекдаха), параўнанні, алегорыі; гіпербала, літота; паэтычны

сінтаксіс — паўторы, рытарычныя звароты, пытанні, воклічы, антытэза, сінтаксічны паралелізм).

12. Мова твора (лексіка — запазычанні, устарэлыя словы, наватворы, эмацыянальна афарбаваныя словы; фразеалогія; марфалагічны склад — частотнасць ужывання часцін мовы).

13. Гукавое аблічча твора (алітарацыя1, асананс2).

14. Метрычная будова. Вершаваны памер (ямб, харэй; дактыль, амфібрахій, анапест), рыфма (мужчынская, жаночая). Цвёрдая форма (санет, трыялет, рандо, танка), вольная форма (верлібр).